# Берасцейскі ўніверсітэт

№ 2 (159)
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
1 сакавіка 2012 года

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**


## Сёння ў нумары:


**Сярод лепшых**
Пра абласны семінар для сакратароў камітэтаў ГА «БРСМ» і камандзіраў штабоў працоўных спраў і падвядзенне вынікаў «Трэцяга працоўнага семестра – 2011» чытайце на
стар. 2

**Сустрэча з рэктарам**
Ці адбыўся дыялог студэнтаў з рэктарам, даведаецеся на
стар. 3

**Гісторыя ўсё ж перасіліла**
Інтэрв'ю з пераможцам конкурса на лепшую доктарскую дысертацыю за 2011 год знойдзеце на
стар. 4

**Яшчэ адно ўзыходжанне**
Як прайшло лыжнае падарожжа ў Карпаты, чытайце на
стар. 8


# Таямніцы слова і думкі

*27 лютага прайшоў адкрыты агульнаўніверсітэцкі конкурс чытальнікаў «Таямніцы слова і думкі». Удзел у ім прынялі 30 выканаўцаў: студэнты нашага ўніверсітэта, а таксама госці з розных навучальных устаноў г. Брэста і Пінска.*

*Конкурс ужо стаў традыцыйным і сёмы раз мае статус адкрытага. У гэтым годзе ён прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры – Я. Купалы і Я. Коласа. Даволі сімвалічна, што 2012 год супаў з аб'яўленым у Беларусі Годам кнігі.*

*Конкурсная праграма складалася з двух аддзяленняў – выканаўчага і аўтарскага. Пакуль журы вызначала пераможцаў, прысутныя пабачылі невялікую канцэртную праграму, падрыхтаваную студэнцкім клубам.*

*Дарэчы, гледачы таксама выказалі сваю прыхільнасць і выбралі пераможцу ў намінацыі «Прыз сімпатый гледачоў». Яго атрымала Анастасія Селівовіч (гістарычны факультэт).*

*У выканаўчым аддзяленні трэцяе месца падзялілі паміж сабой Лізавета Чабурка (гімназія № 6 імя маршала Савецкага Саюза Г.К. Жукава) і Уладзіслаў Гоцін (САШ № 26, Брэст), другое – Таццяна Чмель (філалагічны факультэт) і Вікторыя Атрошчанка (ліцэй № 1 імя А.С. Пушкіна), а перамогу святкавалі Ангеліна Дземідзюк (Брэсцкі абласны ліцэй імя П.М. Машэрава) і Кацярына Цабрук (сацыяльна-педагагічны факультэт).*

*У аўтарскім аддзяленні трэцяе месца ў Андрэя Ганчара (Палескі дзяржаўны ўніверсітэт), другое – у Крысціны Леснік (філалагічны факультэт), а перамога ў Юліі Пятровіч (юрыдычны факультэт).*

*Хочацца верыць, што ва ўсіх прысутных засталіся толькі прыемныя ўражанні.*

*Таму – да наступнага паэтычнага свята!*



## ШТО Ў СВЕЦЕ

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

***Белтелерадиокомпания намеревается в середине марта 2012 года в тестовом режиме запустить канал белорусской культуры «Беларусь-3», сообщил на отчетно-выборной конференции Белорусской конфедерации творческих союзов председатель ассоциации Геннадий Давыдько.***

***«Беларусь-3» станет белорусскоязычным телеканалом, где будет представлена лучшая документалистика, исторические фильмы, достижения мирового кинематографа, дублированные на белорусский язык, ток-шоу культурологического плана, религиозные программы, программы для детей, школьников. Создание нового телеканала предполагается без привлечения бюджетных средств.***

• • •

***Дифференцированный подход к оплате населением электроэнергии планируется внедрить во второй половине 2012 года. Об этом сообщил журналистам министр энергетики Беларуси Александр Озерец.***

***Сегодня прорабатываются вопросы создания социального пакета и гарантий для населения в части оплаты за потребленную электроэнергию. Её потребление будет лимитировано, а то, что потребляется сверх, будет оплачиваться по себестоимости.***

***«Мы просчитали, что 70–75 % населения не пострадает и войдет в эти лимиты, а вот платить больше будут более зажиточные граждане, которые потребляют не по 150–250 кВт.ч в месяц, а более 1000 кВт.ч. Это и будет социальная справедливость, социальное равенство», – считает министр.***

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Сярод лепшых

**16–17 лютага Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт прымаў у сябе абласны семінар для сакратароў камітэтаў ГА «БРСМ» і камандзіраў штабоў працоўных спраў.**

**Семінар стаў лагічным завяршэннем трэцяга працоўнага семестра, на працягу якога было працаўладкавана больш за пяць з паловай тысяч маладых людзей. У складзе 134 атрадаў яны працавалі ў Брэсцкай вобласці, а таксама за мяжой: у Польшчы і Расіі.**

Надзея Шахоўская, галоўны спецыяліст аддзела праектнай дзейнасці ЦК ГА «БРСМ», і Таццяна Венско, другі сакратар Брэсцкага абласнога камітэта ГА «БРСМ», адзначылі, што мінулы працоўны семестр пакінуў станоўчыя водгукі як у працадаўцаў, так і ў саміх студэнтаў. Вядома, не абышлося і без праблем. У прыватнасці, Таццяна Венско звярнула ўвагу калег на новыя правілы справаздачнай дакументацыі, а Надзея Шахоўская паразважала пра праблему далучэння да працы са студэнтамі як мага большай колькасці арганізацый.

Карысную інфармацыю прадстаўнікі раённых камітэтаў маглі запазычыць і з выступу дакладчыкаў на тэматычных занятках. Арганізатары семінара пастараліся закрануць самыя надзённыя і важныя тэмы. Так, абмяркоўваліся працэдура адпраўкі студэнтаў за мяжу і асаблівасці падатковага заканадаўства для ўдзельнікаў студатрадаў. Былі закрануты пытанні пражывання і харчавання на месцах высадкі працоўнага дэсанта, асаблівасці арганізацыі дзіцячых аздараўленчых лагераў і аховы працы.

Абмяркоўваліся і перспектывы на наступны працоўны семестр – лета 2012 года. *«Мы збіраемся падключыць да нашага руху вучняў сярэдніх школ,* – падзялілася планамі Таццяна Венско. – *Раней у гэтым пытанні былі юрыдычныя складанасці, але цяпер яны ліквідаваны. Кожны жадаючы працаўладкавацца пакідае сваё рэзюмэ на нашым сайце, пасля чаго яно адпраўляецца патэнцыйнаму працадаўцу. А далей студэнт сам вольны выбіраць месца дзеяння, грунтуючыся на сваіх перавагах. Так лепш і яму, і яго кіраўніцтву. Наш рух набірае абароты, і гэта не можа не радаваць».*

Варта таксама адзначыць, што ў 2011 годзе вялікая ўвага надавалася навучанню кадраў, якія працавалі ў штабах працоўных спраў. Гэта дазволіла павысіць іх прафесійны ўзровень. У прыватнасці, Пінскі і Столінскі райкамы ГА «БРСМ» арганізоўвалі на базе сваіх вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў практычныя семінары, а на тэрыторыі вобласці праводзіліся шматлікія акцыі, якія праходзілі пад дэвізам «Моладзь – дзецям».

Любое падвядзенне вынікаў не можа абысціся без узнагароджання лепшых і годных. Брэсцкі абласны камітэт ГА «БРСМ» заснаваў 11 асноўных намінацый. Прадстаўнікі БрДУ імя А.С. Пушкіна не засталіся ў баку. Зводны педагагічны атрад імя Дз. Гвішыяні стаў «Лепшым педагагічным атрадам», Юлія Ярашук (атрад «Зорка») першынствавала ў намінацыі «Лепшы камандзір педагагічнага атрада», Таццяна Грыгарэнка (атрад «FUTUREры») адзначана як лепшы камісар. Атрад «Лінгва» атрымаў грамату як лепшае валанцёрскае аб'яднанне ў сферы аказання паслуг. Святлана Мікалаеўна Клімковіч (метадыст аддзела выхаваўчай працы з моладдзю) атрымала падзяку. Падчас узнагароджання першы сакратар Брэсцкага абкама ГА «БРСМ» Віктар Фісюк адзначыў, што сярод ВНУ наш універсітэт аказаў найбольш сур'ёзную канкурэнцыю БрДТУ.

Яго штаб працоўных спраў святкаваў перамогу як лепшы штаб сярод устаноў адукацыі. Граматы і кубак, а таксама званне лепшага будаўнічага атрада атрымаў атрад БрДТУ «Брыганціна», а камісар Андрэй Масілевіч атрымаў грамату ў спецыяльнай намінацыі як лепшы камісар будатрада.

З нецярпеннем чакаем наступнага працоўнага семестра і спадзяемся, што ён нас парадуе новымі поспехамі і дасягненнямі.

*Дзмітрый Шыфрштэйн*
*(філалагічны факультэт, «VП»)*

## АКЦЫЯ

# За любимую Беларусь!




***Новые праздники появляются не так часто. Но вот уже не первый год одна из самых любимых и популярных традиций у молодёжи – День всех влюблённых. По праву его символом можно назвать маленькие открытки в форме сердца – «валентинки».***

*В этом году 14 февраля активисты п/о ОО «БРСМ» нашего университета приняли участие во Всебелорусской акции «За любимую Беларусь!».*

*В фойе учебного корпуса № 1 всем желающим ребята раздавали изготовленные из бумаги красно-зеленые сердечки, на которых можно было написать пожелания друзьям, однокурсникам, семье, родному городу.*

*Эти «валентинки» позже прикреплялись к символу акции – большому сердцу «За любимую Беларусь!».*

*Татьяна Мазан*
*(юридический факультет)*

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

### *Уважаемые читатели и читательницы нашей газеты!*

*Этот выпуск выходит между двумя такими разными, но важными для нас праздниками – Днём защитника Отечества и 8 Марта. Желаем Вам всего самого светлого, доброго. Успехов Вам в работе, побольше улыбок и радостных дней, вдохновения во Всех Ваших начинаниях! Счастья, благополучия Вам и Вашим близким!*



***Редколлегия газеты «Берасцейскі ўніверсітэт»***

**ПАДЗЕЯ**

# Встреча с ректором

**22 февраля состоялась встреча ректора М.Э. Чесновского со студентами биологического, географического, математического и физического факультетов.**

Мечислав Эдвардович рассказал о том, что университету необходимо приспосабливаться к сложившейся экономической ситуации, но, несмотря на существующие трудности, финансирование социально значимых расходов (зарплата работникам и стипендии студентам) не будут урезаны. Также ректор рассказал о том, как прошла коллегия Министерства образования Республики Беларусь, посвященная итогам 2011 года. Кстати, в прошлом году доля образовательных услуг составила 5,2 % от ВВП нашей страны.

Значимым для университета событием стала успешная аккредитация, прошедшая в первой декаде февраля этого года. По результатам комплексной проверки мы подтвердили свое право осуществлять подготовку специалистов высшей квалификации в университетском статусе.

Кроме того, Мечислав Эдвардович ответил на вопросы студентов. Самыми многочисленными были вопросы о повышении оплаты за обучение в БрГУ имени А.С. Пушкина и об общежитиях. Ректор сообщил о том, что существует система рассрочки по семестрам и по месяцам для студентов-платников. Для этого необходимо предоставить соответственные справки о доходах.

Приятной новостью для многих стало известие: 1 сентября этого года планируется введение в эксплуатацию общежития № 1 по улице Ленина.

Также студенты интересовались порядком организации учебного процесса, возможностями переоснащения учебных аудиторий и многим другим. Были и такие вопросы, как «Какое высшее учебное заведение Вы закончили?», «Какую книгу прочли недавно и собираетесь ли писать свои книги?», которые адресовались лично Мечиславу Эдвардовичу.

Встреча прошла в рабочей атмосфере, и можно сказать: диалог получился.

*Марина Юдчиц (географический факультет)*



## НАШЫ НАВІНЫ

***24 лютага адбылося чарговае пасяджэнне Савета ўніверсітэта. Асноўным пытаннем стала справаздача «Аб дзейнасці цэнтра інфармацыйных тэхналогій універсітэта» начальніка ЦІТ А.І. Грузінскага.***

***Таксама на Савеце ўніверсітэта з інфармацыяй «Аб фінансава-эканамічнай дзейнасці ўніверсітэта ў 2011 г.» выступіў рэктар М.Э. Часноўскі.***

***Мечыслаў Эдвардавіч адзначыў, што фонд матэрыяльнага заахвочвання работнікаў і фонд вытворчага і сацыяльнага развіцця ўзраслі адпаведна на 23 % і 7,3 %.***

***Таксама ў выніку намаганняў работнікаў усіх падраздзяленняў, рацыянальнага размеркавання наяўных рэсурсаў і наладжанай кіраўніцкай дзейнасці ў параўнанні з 2010 г. кансалідуючы бюджэт універсітэта вырас на 60,38 %; таксама павялічыліся сродкі ад пазабюджэтнай дзейнасці на 54 %, памер адукацыйных паслуг павялічыўся на 51,3 % і неадукацыйных – на 57,43 %; экспарт адукацыйных паслуг склаў 151,2 %. Дарэчы, большасць структурных падраздзяленняў выканала даведзены план пашырэння неадукацыйных паслуг.***

***Доля пазабюджэтных сродкаў у кансалідуючым бюджэце ўніверсітэта знізілася да 46 %.***

• • •

***21 лютага ў нашым універсітэце прайшоў Дзень роднай мовы. Усе жадаючыя змаглі паўдзельнічаць у розных мерапрыемствах. Так, у бібліятэцы працавалі кніжныя выставы «Родная мова – крыніца празрыстая» і «Свята беларускай мовы». Яшчэ адну выставу-прэзентацыю – «Гісторыя мовы на старонках старадрукаў» – падрыхтавалі кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі, беларускага мовазнаўства, агульнага і рускага мовазнаўства.***

***Размаўляць па-беларуску на інтэрактыўных перапынках запрашалі студклуб і аддзел выхаваўчай работы з моладдзю, а ў вечары ў інтэрнаце № 2 адбылася folk-style вечарына «Ойра».***

• • •

***Абласная зімовая спартакіяда «Брэсцкая лыжня – 2012» прайшла 18 лютага ў пасёлке Мір Баранавіцкага раёна. Сярод яе ўдзельнікаў былі і прадстаўнікі нашага ўніверсітэта. Гэта прарэктар па адміністратыўна-гаспадарчай працы С.У. Клімук, дэкан факультэта замежных моў С.М. Севярын, намеснік дэкана біялагічнага факультэта па выхаваўчай працы К.І. Гурына, намеснік дэкана факультэта фізічнага выхавання па навуковай працы А.В. Шароў.***

***Каманда БрГУ імя А.С. Пушкіна прыняла ўдзел у лыжнай эстафеце сярод вышэйшых навучальных устаноў і заняла 3-е месца.***

***Віншуем!***

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

## АСОБА



**Калі я ішла на інтэрв'ю, то трошкі хвалявалася. Таму што сустракацца мне трэба было з загадчыкам кафедры гісторыі славянскіх народаў. Але ж мае трывогі не спраўдзіліся: Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч аказаўся цікавым суразмоўцам. Дарэчы, яго доктарская дысертацыя «Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» стала пераможцай у конкурсе на лепшую доктарскую дысертацыю за 2011 год, які правяла Вышэйшая атэстацыйная камісія Рэспублікі Беларусь. Да таго ж, у гэтым годзе ў Аляксандра Мікалаевіча своеасаблівы прафесійны юбілей: 20 год ён працуе ў нашым універсітэце. Аб гэтым і пра іншае шла наша размова.**

# Гісторыя ўсе ж перасіліла...

**– Раскажыце, калі ласка, пра сябе.**

– Мая працоўная біяграфія пачалася ў 1990 годзе, калі я скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і прыехаў па размеркаванні працаваць у школу. Праз паўтары гады я па конкурсе быў абраны на пасаду асістэнта кафедры беларусазнаўства тады яшчэ Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута. І вось з таго часу я працую ва ўніверсітэце на розных пасадах: асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, намеснік дэкана гістарычнага факультэта, дэкан, а з 2008 года ўзначальваю кафедру гісторыі славянскіх народаў. Ужо два дзесяцігоддзі ў мяне звязаны з працай ва ўніверсітэце.

**– Чаму менавіта гісторыя?**

– Гісторыя была адным з маіх любімых прадметаў у школе, але я думаў і пра журналістыку. Дарэчы, я шмат пісаў у розныя рэспубліканскія і саюзныя газеты, напрыклад, у «Вянец Беларусі», у «Піянерскую праўду». Таксама я перапісваўся з рэдакцыямі выданняў, удзельнічаў у розных конкурсах. Але ў апошні год гісторыя ўсе ж такі перасіліла. Нямалая заслуга ў гэтым і майго школьнага настаўніка, былога дырэктара Рубельскай сярэдняй школы – Адама Міхайлавіча, чалавека вельмі таленавітага, які выкарыстоўваў у школе наватарскія педагагічныя методыкі. Менавіта ён зацікавіў мяне гісторыяй. Таму і выбар прафесіі адпаведны.

**– Раскажыце пра конкурс на лепшую доктарскую дысертацыю.**

– Конкурс на лепшую доктарскую дысертацыю года праводзіцца пачыная з 2009 года. Лаўрэаты вызначаюцца ў чатырох намінацыях: па гуманітарных, прыродазнаўчых, медыцынскіх і ветэрынарных, а таксама тэхнічных і сельскагаспадарчых навуках. У 2011 годзе вырашыў паўдзельнічаць у конкурсе і я. Мне вельмі прыемна, што мая дысертацыя перамагла ў сваёй намінацыі.

**– Чаму Вас зацікавіла менавіта гэта тэма?**

– У пачатку 90-х я стаў цікавіцца такім феноменам, як беларуская адукацыя ў межах польскай дзяржавы ў 20–30-я гг. XX ст. Таксама вялікі ўплыў на мяне аказала знаёмства з Уладзімірам Андрэевічам Калеснікам, адным з першых прафесараў нашага ўніверсітэта.

**– Якім быў шлях да перамогі ў конкурсе?**

– Спачатку я рыхтаваў кандыдацкую «Становішча і праблемы выхавання беларускай школы ў 1921–1939 гг.», а потым пачаў праводзіць шырокія даследаванні па ўсіх напрамках гэтай тэмы з выкарыстаннем польскіх крыніц. Прыходзілася працаваць у архіўных установах трох краін: Беларусі, Літвы і Польшчы. А гэта вельмі многа архіўных даведак. Каб апрацаваць усе гэтыя крыніцы (а іх 114) на розных мовах, затраціў не адзін год. А потым усе патрэбна было выкладаць канцэптуальна.

**– Якія ў Вас планы на бліжэйшую будучыню?**

– Безумоўна, калі працуеш у навуцы, то не спыняешся, і не думаеш спыняцца. Ёсць намеры далей паглыбляць, пашыраць праблематыку гісторыі Заходняй Беларусі. Таксама хачу заняцца праблемамі мікрагісторыі. Гэта мае бліжэйшыя планы...

**– Дзякуй за цікавую бяседу, поспехаў Вам у далейшай навуковай дзейнасці!**

*Марына Юдчыц*
*(геаграфічны факультэт)*

## НАШЫ НАВІНЫ

***З 16 па 17 лютага ў нашым універсітэце прайшла 3-я Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе школ і ВНУ», прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння прафесара Уладзіміра Якаўлевіча Навуменкі.***

***Работа вялася па шасці секцыях: краязнаўства і сучаснасць, краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе школ і ВНУ, пазакласная і пазашкольная краязнаўчая работа, краязнаўства і навукова-даследчая работа студэнтаў, краязнаўства і турызм, краязнаўства і экалогія. Усяго ўдзел у канферэнцыі прынялі 88 чалавек.***

## НАШЫ НАВІНЫ

***24 лютага на пасяджэнні Савета ўніверсітэта адбылося ўзнагароджанне пераможцаў па выніках універсітэцкага конкурсу на лепшае студэнцкае навукова-даследчае аб'яднанне 2011 года.***

***Лепшай СНДА стала студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя «Праблемы супрацьдзеяння правапарушэнням у сферы грамадзянскіх і гаспадарчых стасункаў» (навуковы кіраўнік – Т.А. Гарупа).***

***Перамогу сярод СНДА ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук атрымала студэнцкая навукова-даследчая група «Асоба і соцыум» (навуковы кіраўнік – Г.М. Казаручык), у галіне прыродазнаўчых навук – СНДГ «Неарганік» (навуковы кіраўнік – Н.С. Ступень).***

***Усе пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі і сертыфікатамі.***

***Віншуем!***

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Прафсаюзны лідар

**25 января в учреждении образования Федерации профсоюзов Беларуси «Международный университет “МИТСО”» состоялся финал республиканского конкурса «Прафсаюзны лідар». Победителем в номинации «Лидер первичной профсоюзной организации обучающихся учреждения образования, профсоюзной организации структурного подразделения» стала председатель профкома студентов нашего университета И.А. Жак. Своими впечатлениями о том, как проходил конкурс Инна Алексеевна поделилась с нашей газетой.**



**– Инна Алексеевна, расскажите, пожалуйста, о конкурсе.**

– 22 февраля 2011 года Президиумом ЦК профсоюза принято постановление о проведении Республиканского конкурса «Прафсаюзны лідар». Он проходил в три этапа: в первом определяли лучших среди районных и городских первичек, во втором – среди победителей региональных конкурсов.

Третий этап, состоящий из двух туров, стартовал в сентябре. Для участия в этом этапе свои материалы подали 32 кандидата. Более двух месяцев ушло на проведение экспертизы и оценку представленных работ. Здесь оценивались анкеты конкурсантов и методические разработки «Профсоюзного урока». Жюри особое внимание уделяло отражению творческого характера конкурсанта; чёткости, лаконичности и логичности изложения им информации; актуальности и социальной значимости материала; а также соблюдению требований к оформлению работы. Ответы на заданные вопросы анкеты и разработки уроков оценивались по 10-балльной системе.

После подведения результатов во второй тур вышли 14 конкурсантов. Стоит сказать, что все они показали высокий уровень подготовки, поэтому далее победителей определяли исключительно в номинациях.

Финалисты конкурса награждены дипломами и денежными призами, а победители в номинациях – также Почётными грамотами ЦК профсоюза.

**– Как проходила Ваша подготовка к финальному этапу?**

– К финалу я подготовила домашнее задание (визитку) «Председатель профкома – это звучит гордо!», фрагмент профсоюзного урока, а также готовилась к интеллектуальному конкурсу (вопрос – ответ) по всем направлениям профсоюзной деятельности.

**– Какое задание было для Вас самым интересным?**

– Можно сказать, что все этапы конкурса были запоминающимися, но для меня методическая разработка профсоюзного урока стала как самым сложным, так и, вместе с тем, самым интересным заданием. Тема моего урока – «Правовое регулирование распределения, перераспределения, направления на работу выпускников и практика применения в учреждении образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина». К слову, урок имеет практикоориентированный характер, и его можно использовать в любом другом учреждении образования. Те формы и методы, которые я предлагаю, позволяют студентам в непринуждённой форме познакомиться с основными понятиями, процедурами, которые прописаны в Кодексе Республики Беларусь об образовании. Также мне запомнилось задание, в котором, нужно было за две минуты показать фрагмент профсоюзного урока.

*Продолжение на странице 7*

*У студзені Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана*

***Тацяна Андрэеўна Вярэніч,*** *бібліятэкар чытальнай залы № 2.*

***Віншуем!***

У НАС НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

## Как научиться учиться?

**9 февраля в стенах Брестской областной библиотеки имени М. Горького прошёл межвузовский семинар «Актуальные вопросы молодёжной культуры на страницах периодической печати Беларуси и Германии». Организатором его выступила кафедра немецкого языка с методикой преподавания, участниками стали студенты третьего курса БрГУ имени А.С. Пушкина и БрГТУ.**

Специалисты библиотеки подготовили для участников семинара тематическую выставку «Молодежь Беларуси и Германии на страницах газет и журналов». Экспозиция состояла из двух частей: в первой была представлена художественная, научная и учебно-методическая литература, а также периодическая печать Германии, для второй сотрудники библиотеки подготовили информацию о белорусских печатных изданиях, освещающих на своих страницах проблемы молодежной культуры.

Студентам предложили поучаствовать в Workshop. Ребят поделили на группы, каждая из которых должна ознакомиться с определённым немецким периодическим изданием (журналом или газетой) и подготовить о нём небольшую презентацию. *«Такая форма проведения семинара предполагает лингвокультурологический подход в изучении иностранного языка и позволяет не только совершенствовать лингвистическую компетенцию обучаемых, но и, изучая актуальные периодические издания, получить дополнительную информацию о социокультурных особенностях своей страны и страны изучаемого языка»*, – отмечает Ирина Фёдоровна Нестерук, завкафедрой немецкого языка с методикой преподавания.

К слову, это уже не первый опыт сотрудничества кафедры и областной библиотеки. Например, традиционно первокурсники, студенты факультета иностранных языков, отправляются на обзорную экскурсию в библиотеку.

*Евгения Мороз*

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

## ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ

***Женщины не допускались к участию в первых Олимпийских играх, однако гречанка Стамата Ревихти, по прозвищу Мельпомена, захотела участвовать в марафоне. Ей отказали, и тогда она одна пробежала дистанцию на следующий день после официального забега. В завершение она оббежала вокруг Мраморного стадиона: ей даже запретили завершить дистанцию на его территории, как это делали участники-мужчины.***

***Через 10 лет в Афинах прошла ещё одна Олимпиада. Однако она не была включёна МОК в официальный список Игр и получила статус «внеочередной». Следующие официальные Игры прошли в греческой столице лишь через 108 лет, в 2004 году.***

***Только в 1896 году прошли такие виды соревнований, как: велогонки на 10 и 12 км; спринтерская гонка на 2 км (на последующих Играх она сократилась до 1 км); гимнастические командные соревнования на перекладине и брусьях; заплывы на дистанции 500 м и 1200 м, заплыв в матросской одежде.***

***Спортсмены Вигго Йенсен, Карл Шуман и Ланчестон Эллиот выступали в четырёх разных видах, Хольгер Нильсен и Момчило Тапавица – в трёх, а ещё 12 участников – в двух.***

***В этих Играх принимал участие самый молодой спортсмен за всю историю Олимпиад – Димитриос Лундрас, бронзовый призёр по спортивной гимнастике. Ему было 10 лет и 218 дней.***

*Александр Андросюк*
*(факультет физического воспитания)*

## АЛІМП-СЛОЎНІК

# Возрождение Олимпиады

Первые летние Олимпийские игры современности прошли более 115 лет назад, в 1896 году, в Афинах (Греция). В них участвовали 241 спортсмен из 14 стран. Всего было разыграно 43 комплекта медалей в 9 видах. Эти Игры сильно отличались от тех, которые мы привыкли видеть сейчас: например, не было многих традиций, таких, как зажжение Олимпийского огня и вручение золотых медалей.

Организаторы не следили за национальностями игроков и за медальным зачётом, поэтому дошедшие до нас сведения могут сильно различаться. Однако сейчас Международный олимпийский комитет занимается уточнением результатов и других данных обо всех Олимпийских играх.

Как и у любого другого значимого события, у обновлённых Олимпийских игр есть своя предыстория.

23 июня 1894 года в Сорбонне (Париж) прошёл первый конгресс Международного олимпийского комитета. Его созвал барон Пьер де Кубертен для того, чтобы объявить о своем проекте возрождения Олимпийских игр. Идея проведения подобных мероприятий была не нова: в течение XIX века в различных европейских странах состоялось несколько локальных спортивных мероприятий, организованных по образцу античных Олимпийских игр. Однако именно Кубертен первым предложил сделать такие Игры традиционными, интернациональными и объединяющими в себе соревнования по многим видам спорта.

Новость о возрождении Олимпийских игр взбудоражила мировую общественность. В Греции с особым воодушевлением ожидали начала соревнований. Однако вскоре стали очевидны серьёзные трудности, которые предстояло преодолеть организаторам. Проведение соревнований столь высокого уровня требовало солидных финансовых затрат, в стране же бушевал экономический и политический кризис. Казалось, что Олимпийским играм не суждено состояться. Тогда принц Константин лично встал у руля организационного комитета, что само по себе уже вызвало приток инвестиций. Он реорганизовал комитет, удалив из него всю оппозицию, принял ряд мер по привлечению частного капитала и тем самым спас ситуацию.

Церемония открытия прошла 6 апреля 1896 года. Дата была выбрана не случайно: в этот день пасхальный понедельник совпал сразу в трёх направлениях христианства – в католицизме, православии и протестантизме. Кроме того, в Греции 6 апреля отмечается День независимости. На торжественном открытии Игр присутствовало около 80 тысяч зрителей, в том числе почти вся королевская семья – король Георг I, его жена Ольга и их дети. Эта первая церемония заложила две олимпийские традиции – открытие Игр главой того государства, где проходят соревнования, и исполнение Олимпийского гимна. Соревнования проходили в 9 видах спорта: борьба, велоспорт, лёгкая атлетика, плавание, спортивная гимнастика, стрельба, теннис, тяжёлая атлетика и фехтование.

*Александр Андросюк*
*(факультет физического воспитания)*

## ФОТАФАКТ



***24 лютага ў галерэі «Вытокі творчасці» нашага ўніверсітэта адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы работ выкладчыкаў кафедры тэорыі і методыкі эстэтычнага выхавання. Выстава прымеркавана да Дня абаронцы Айчыны.***

***Удзел у выставе прынялі работы І.А. Раманчука, У.В. Недушэўскага, І.П. Колчук, М.У. Марчук, В.І. Марчука і В.М. Атрошкі. Варта адзначыць разнастайнасць прадстаўленых жанраў: гэта пейзаж, партрэт, тэхніка батыку і манатыпіі, беларуская выцінанка і кераміка.***

***Сярод гледачоў прысутнічалі рэктар БрДУ імя А.С. Пушкіна М.Э. Часноўскі і першы прарэктар А.М. Сендзер. Мечыслаў Эдвардавіч выказаў захапленне творчым почыркам мастакоў і пажадаў ім далейшых поспехаў.***

***Прыемным падарункам для ўсіх прысутных стала выступленне студэнцкага хору (пад кіраўніцтвам А.П. Грыняка). Таксама вядучыя запрасілі гледачоў паўдзельнічаць у невялікай экскурсіі.***

***Арганізатарам мерапрыемства стала кафедра тэорыі і методыкі эстэтычнага выхавання і непасрэдна Л.А. Захарчук і І.П. Колчук.***

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

## ФОТАФАКТ



***17 лютага прайшоў Дзень спантаннай праявы дабрыні. Да ўдзелу ў ім далучыліся і студэнты. Так, маладзёжная інфармацыйная група разам з саветам валанцёраў універсітэта правялі флэш-моб, удзельнікам якога раздавалі флаеры і буклеты. На іх надрукавалі вершы і афарызмы пра дабрыню, а таксама спіс добрых спраў, якія кожны можа зрабіць.***

***На матэматычным факультэце адбылося экспрэс-апытанне «Дабрыня – гэта», а таксама акцыя «Рабі дабро».***

***Акцыю «Добры ўчынак» правялі валанцёры атрада «Юность» (юрыдычны факультэт), а валанцёрскі атрад «Смайл» факультэта фізічнага выхавання ў Палацы водных відаў спорту аказваў дапамогу ў правядзенні спаборніцтваў па настольным тэнісе для навучэнцаў устаноў адукацыі Маскоўскага раёна г. Брэста.***

## ЗНАЧНА

# Страницами прав человека

**Сегодня мировая общественность, педагоги-практики, ученые, общественные и политические деятели вплотную подошли к идее формирования культуры прав человека. Хотя идея ещё находится в процессе становления, уже очевидно, что для воплощения её в жизнь потребуется усердная исследовательская и практическая работа.**

**Итогом плодотворной работы Межвузовского научно-методологического семинара «Совершенствование системы образования правам человека. Права человека: понимание и роль в обществе (по концепции и методике профессора И.И. Котляра)» стало издание сборника материалов.**

Издание будет интересно специалистам, преподавателям учебного курса «Права человека», студентам, изучающим вышеназванный курс в системе высшего образования, а также сотрудникам управления системы образования, государственных учреждений, лекторам общества «Знание», всем тем, кто интересуется проблемой прав человека. Мы приглашаем преподавателей университета и других желающих ознакомиться с материалами семинара, это позволит им получить ответы на ряд вопросов. В чём заключается сущность прав человека? Какова их структура? Как соотносятся права человека и права гражданина? В чём проявляется духовно-нравственная сущность прав человека? Какую функцию выполняют права человека в обществе – созидательную или разрушительную? В чём проявляется взаимосвязь прав человека и гражданского общества?..

Оргкомитет семинара благодарит Представительство ООН в Республике Беларусь, лично А. Брука, Представителя ООН, за финансирование издания материалов семинара, а также В.В. Радзивиновского, главу Департамента общественной информации Представительства ООН в Республике Беларусь, ректорат университета за помощь в организации семинара.

Нельзя не отметить то, что Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина находится в авангарде высших учебных заведений Беларуси в сфере образования и обучения правам человека, что по инициативе профессора И.И. Котляра и при поддержке Представительства ООН в Республике Беларусь работа Межвузовского научно-методологического семинара преподавателей учебного курса «Права человека» приобрела систематический характер, а сам семинар является постоянно действующим. Очередным подтверждением вышесказанного является подготовка к проведению в марте текущего года семинара на тему «Становление и развитие гражданского общества – важнейшее условие и гарантия реализации прав человека».

*Э.Н. Северин*
*(преподаватель кафедры политологии и социологии)*

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

*Начало на странице 4*

**– Кто Вам помогал в подготовке к конкурсу?**

– У меня была группа единомышленников, которая помогала творить. Это наши студенты Анна Пропушняк (социально-педагогический факультет), Светлана Иванова (исторический факультет), Ольга Пустовая (психолого-педагогический факультет), а также выпускники Елена Казакевич и Илья Шамилов (психолого-педагогический факультет), Ирина Поюта (математический факультет). Я им очень благодарна!

Также мне оказывали помощь заместитель председателя Брестского областного комитета профсоюза работников образования и науки Александра Александровна Драпей, декан социально-педагогического факультета Надежда Александровна Леонюк и аспирантка кафедры педагогики второго года обучения Татьяна Васильевна Соколова.

Очень приятно, что во время финала меня поддерживали болельщики, среди них – наши студенты, профсоюзные активисты, мои коллеги по работе, работники обкома профсоюза, а также учителя из г. Бреста и области.

**– Скажите, а участвовали ли Вы ранее в подобных конкурсах?**

– Конкурс такого рода проводился впервые. В тех конкурсах, которые проходили ранее, первичная профсоюзная организация студентов нашего университета всегда участвовала и занимала призовые места. К слову, сейчас мы с моей коллегой Ларисой Борисовной Челышевой, председателем профкома работников университета, ждём результатов ещё одного республиканского конкурса на лучшую реализацию коллективных договоров.

*Евгения Мороз*

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

## УРАЖАННЕ

# «Зимняя школа» для студентов

**Каждые два года спортивно-оздоровительный комплекс БГУ «Бригантина» собирает журналистов университетских и факультетских СМИ. В этом году «Зимняя школа студенческой журналистики» распахнула свои двери для 200 ребят из более чем 40 высших учебных заведений страны. От нашего университета честь принять участие в республиканском семинаре-практикуме выпала мне.**

С 17 по 19 февраля мы смогли поучаствовать в работе разных секций (дизайн газеты, Интернет-версии университетских СМИ, стилистика и др.), а также посетить мастер-классы от ведущих белорусских журналистов.

Одним из самых запоминающихся и динамичных мероприятий стало «Журналистское расследование». Нас поделили на восемь команд. Они должны были разыскать людей в тематических костюмах, чтобы узнать у них определённую информацию, которая поможет раскрыть преступление и найти клад. Команды не только участвовали в развлекательных мероприятиях, но и в течение двух дней готовили выпуск газеты. Как оказалось, это вполне реально.

На пресс-конференции с Министром образования Республики Беларусь С.А. Маскевичем и ректором БГУ С.В. Абламейко каждый смог задать вопросы, которые интересуют студентов. Самым актуальным оказался вопрос о стоимости проживания в общежитии.

На закрытии семинара организаторы вручили дипломы представителям университетских СМИ, которые победили в различных номинациях. К сожалению, наша газета «Берасцейскі ўніверсітэт» не получила наград, но будем надеяться, что через два года представители БрГУ имени А.С. Пушкина вернутся из Минска не с пустыми руками.

За три дня мы сплотились и подружились. Разъезжаясь по домам, долго прощались и обменивались координатами, чтобы продолжать общаться. Можно с уверенностью сказать: каждый из нас увёз в свой университет большой багаж знаний и впечатлений.

*Денис Троцюк*
*(филологический факультет)*

# Валентинки для биологов



**К организации праздников биологический факультет всегда подходит творчески. И День всех влюблённых не стал исключением.**

Ещё за неделю до праздника в фойе шестого этажа разместилась «Почта влюблённых», через которую каждый желающий мог отправить открыточку с пожеланиями добра и радости. Ну а для тех, кто не успел запастись валентинками, активисты биологического факультета заготовили их вволю. В конце дня письма в каждую группу разносил Ангелочек.

Также 14 февраля в фойе биологического факультета висел огромный лист для пожеланий, а девушки раздавали студентам и преподавателям сердечки, на которых можно было написать пожелание и прикрепить к ватману.

*Екатерина Басалай*
*(биологический факультет)*

## ПАДАРОЖЖА

# Ещё одно восхождение



**С 27 января по 5 февраля участники турклуба «Берестье» прошли лыжный маршрут в Карпатах (Украина). Группа состояла из семи человек – студентов юридического, географического и математического факультетов.**

Мы побывали в красивейших местах горной системы – на хребте Горганы. Горганы – так на Украине называют огромные замшелые валуны, которые в изобилии покрывают склоны древних гор. Протяженность маршрута составила около 100 километров, а кульминацией похода стало восхождение на высшую точку хребта (её высота составляет 1836 м) – гору Сивуля.

Этот поход стал первым для ребят, которые пришли в турклуб в сентябре 2011 года.

*В.В. Гусев*
*(руководитель турклуба «Берестье»)*

**«Берасцейскі ўніверсітэт» № 2 (159) люты 2012 г.**

**Рэдакцыя:** рэдактар – Я.В. Мароз (тэл. 21–65–64).
Фота – Р.У. Хрыстафораў.
Куратар газеты – Л.А. Гадуйка.
Тэхнічны рэдактар – Э.С. Платонава
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВЦ.
БрДУ імя А.С. Пушкіна,
224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на ризографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 01.03.2012 г.
Аб'ём 1,0 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 72.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***